**В. А. Кахновіч**

# ЛАТЫШСКІЯ КАЛАНІСТЫ Ў МАЁНТКУ ГОРВАТАЎ НА ПАЛЕССІ (другая палова XIX — пачатак XX ст.)

Асветлены пытанні заснавання калоніі латышоў у маёнтку Нароўля, якім у другой палове XIX — пачатку XX ст. валодалі памешчыкі Даніла Ігнатавіч і Артур Данілавіч Горваты. Прадстаўлены сацыяльны воблік тыповага латышскага селяніна-перасяленца, акрэслены ўмовы і характар гаспадаркі калоніі латышоў, а таксама матывы памешчыка і характар узаемадачыненняў арандатараў і землеўласніка. Як вынік, робіцца станоўчая ацэнка гаспадарчых магчымасцей каланістаў-латышоў у сувязі з унутранымі матывамі іх веравызнаўчых практык.

In this article have been presented the questions of the basis of a Latvians' colony in the landowners' Daniel Ignatovich and Arthur Danilovich Horwatts manor Narovlia in the second half XIX — the beginning XX-th century. Are presented social type of Latvian peasant-immigrant, conditions and character of the economy in Latvians colony and also motives of the landowner, character of relations between tenants and landowners. As a result, given a positive assessment of the economic potential of the Latvians colonists in connection with the internal motives of their practices following the faith.

*Ключавыя словы*: сацыяльныя працэсы; скасаванне прыгоннага права; землеўладанне; арэндныя адносіны; каланісты; латышы; памешчыкі; этас гаспадарання; маёмасныя канфлікты; прадпрымальніцтва.

*Keywords*: social process; the cancellation of serfdom; landed property; the rent relations; colonists; Latvians; landowners; ethos of managing; property conflicts; business.

На сучасным этапе ў беларускай і сусветнай гістарыяграфіі надзвычай запатрабаваны веды пра асобы і мясціны, што раней былі часта толькі зменлівымі і выпадковымі пераменнымі ў гістарычных наратывах. Напэўна, наступным і належным вітком засваення гісторыі стане паглыбленне ў дэталі і спроба даследчыка-гісторыка і проста цікаўнага сучасніка падступіцца да чалавека, да асобы ў мінулым, каб пабачыць яго ў тых абставінах і акалічнасцях эпохі, што дзейсна вызначалі яго жыццёвую прастору як суб'екта і аб'екта гістарычнага дзеяння. У падобным рэчышчы зараз гісторыкі спрабуюць выявіць і паказаць жыццё лакальных супольнасцей. І, як падаецца, гэта дазваляе рэльефна паказаць сітуацыі, калі адбывалася сустрэча карэнных і новых, прыбылых аднекуль далёка звонку жыхароў асобных вёсак, валасцей, гарадоў. Цікава гэта і ў тым разрэзе, што так выяўляюцца нюансы прагрэсу і традыцыйнага ладу жыцця, сілы мадэрнізацыі і сацыяльнай інерцыі.

Усё тое разам дазваляе сучасніку, без сумніву, глыбей пабачыць складаныя і неадназначныя вытокі цяперашняга дня. Так, сёння на пачатку III тысячагоддзя новай эры нельга паранейшаму бачыць і разумець свет падзеленым на замкнутыя монакультурныя ячэйкі. Нягледзячы на ўвесь той страх, а часам нават і палітычную істэрыю, што хвалюе зараз Еўропу (і не толькі) у сувязі з «нашэсцем» бежанцаў з Блізкага Усходу, зразумела, што далейшае пашырэнне і паглыбленне кантактнай зоны паміж прадстаўнікамі розных культур непазбежнае ў будучыні. Таму жыхарам Беларусі, як і іншым носьбітам еўрапейскіх, славянскіх і неславянскіх культур, варта распрацоўваць перспектыўныя мадэлі ўзаемадачыненняў да ўмоў мультыкультурнага свету. Пэўна, карысным тут можа быць досвед мінулага, асабліва ў плане даследчыцкай оптыкі, набліжанай да чалавека. Магчымасці крынічнай базы, гіпотэза аб асаблі-

**Кохнович Виктор Адамович** — доцент кафедры истории России Белорусского государственного университета, кандидат исторических наук. E-mail: Esperovic@mail.ru

вай успрымальнасці ў цэлым архаічнага Палесся да ўсяго новага, як і метадалагічная мэтазгоднасць, скіроўваюць увагу на латышскіх каланістаў ва Усходнім Палессі ў XIX ст.

Латышы здаўна былі суседзямі беларусаў. У VIII—IX стст. крывічы-палачане рассяліліся ў сярэднім Падзвінні і прасоўваліся на захад, у кантактную зону з продкамі сучасных латышоў (латгалы, селы, земгалы, лівы, куршы). Хутчэй за ўсё, пад ціскам латгалаў, якіх у сваю чаргу штурхалі палачане, селы («жыхары азёрнай зямлі») сышлі з сучаснай Латгаліі, азёрнага краю, за р. Даўгаву (Заходняя Дзвіна) [1]. У сярэдзіне IX ст. (862) Полацк быў значным гандлёвым горадам, палітычным цэнтрам Полацкай зямлі-княства са сваёй княскай дынастыяй скандынаўскага паходжання. Заходняя Дзвіна была важнай гандлёвай артэрыяй, адгалінаваннем вядомага «шляху з вараг у грэкі». Гэта штурхала Полацк да ўстанаўлення кантролю над яе ніжнім цячэннем. Відаць, у IX ст. узніклі першыя гарады Полацкай зямлі ў сумежжы з селамі і латгаламі: Браслаў (значны як крэпасць напачатку XI ст.), у X ст. — Мядзел, Паставы, у XI ст. — Дзісна, а таксама Герцыке і Кукенойс на тэрыторыі Латвіі. З канца XI ст. і да 30-х гг. XIII ст. існавала асобнае васальнае ад Полацка Герцыкскае княства і да 1208 г. — Кукенойскае.

Нямецкая заваёва абмежавала, але не магла перарваць сувязі даўніх «латышоў» і «беларусаў». Напрыклад, у 1566 г. Інфлянты (Лівонія) былі прыняты ў склад Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), а з 1569 г. сталі часткай Рэчы Паспалітай (РП). Пасля дынастычнай вайны Вазаў за Швецыю ў складзе ВКЛ (1629) засталася толькі Латгалія, што адышла да Расіі ў 1772 г. па першым падзеле РП. У 1802 г. была створана Віцебская губерня, у складзе якой былі Дзвінскі (Дынабурскі), Рэжыцкі і Люцынскі паветы з пераважна латышскім насельніцтвам (39, 58 і 64 % жыхароў адпаведна на 1897 г.). Беларускае Падзвінне мела найбольш цесныя стасункі з латышамі. Так, шмат бежанцаў-латышоў у часы Першай сусветнай вайны асела ў Віцебску, дзе існаваў латышскі раён у Маркаўшчыне [2, с. 7].

У меншай ступені была заўважана латышская прысутнасць у іншых частках Беларусі. Апошні перапіс 2009 г. у Беларусі налічыў толькі 1549 латышоў, з якіх 70,2 % пражывалі ў горадзе і выявілі сваю моцную асіміляванасць: толькі 386 чалавек (25 %) назвалі роднай мовай латышскую, а 62,6 % (970 чалавек) — рускую. У 1999 г. у Беларусі налічвалася 2239, а ў 1959 г. — 2631 латыш [2, с. 22; 3; 4, с. 235]. Гэтая прысутнасць была больш істотная ў папярэднія часы: у 1926 г. у БССР было 14 061 латыш, ці 0,3 % ад усяго насельніцтва рэспублікі, з якіх 8,8 тыс. чалавек (63 %) пражывалі ў Віцебскай вобласці і канцэнтраваліся (3 тыс. чалавек) у Полацкай акрузе [2, с. 34—35]. Гэта былі пераважна вясковыя жыхары, што пражывалі кампактнымі калоніямі, і ў масе сваёй (звыш 11 тыс. чалавек) — рэпрэсіраваныя ў 1930-я гг. [4, с. 235].

Пачаткі шырокага навуковага даследавання латышоў у Беларусі неабходна аднесці да 1920-х гг. У 1927 г. у сувязі з рэарганізацыяй Інбелкульту ўзнікла Латышская камісія, што была ачалена Карлам Шкільтэрам. У 1929 г. гэтая камісія была пераўтворана ў латышскі сектар Беларускай акадэміі навук. Шкільтэр выдаў распрацаваную ім «Праграму даследавання латышскіх калоній» у Беларусі і правёў у 1929—1930 гг. некалькі экспедыцый па Беларусі дзеля вывучэння латышскага насельніцтва. Як вынік — у 1931 г. пабачыла свет яго грунтоўная праца «Латышскія калоніі на Беларусі: гістарычнае развіццё латышскіх сялянскіх гаспадарак» [5]. У ёй прастаўлены ўнікальныя вынікі палявых даследаванняў, асветлены побыт часткі беларускага вясковага асяродку, што ў часы сталінскіх рэпрэсій быў знішчаны. К. Шкільтэр першым паказаў, як узніклі пасля скасавання прыгону латышскія калоніі ў глыбіні Беларусі. У 1863 г. першую партыю латышоў з Курляндыі прывёз у маёнтак Грудзінаўка Быхаўскага павета граф Талсты. Памешчык з Бабруйскага павета барон Унгерн даставіў у свой маёнтак Рудабелка 72 сям’і (360 чалавек) з Курляндыі. Выявіў К. Шкільтэр і прычыны перасялення: малазямелле і высокія арэндныя кошты на зямлю прымушалі латышоў перасяляцца на іншыя землі, у тым ліку ў Беларусь, дзе пасля скасавання прыгону сяляне не жадалі працаваць на

памешчыка [5, с. 40, 51, 59]. Прынцыповае значэнне мае вызначэнне аўтарам ва ўсіх калоніях латышоў Беларусі «пераважна самай экстэнсіўнай гаспадаркі» [5, с. 72].

У далейшым распрацоўку латышскай праблематыкі ў Беларусі працягнуў У. В. Тугай. У 1992 г. выйшла яго (сумесная з А .В. Галавачом) праца «Дзе песні з Даўгавы гучалі». У ёй была ўзнята праблема Віцебскай Латгаліі, удакладзены звесткі аб пачатках латышскай аграрнай эміграцыі ў Беларусь другой паловы XIX ст., а таксама ўпершыню згадана латышская калонія ў маёнтку Горватаў Нароўля. Важна і тое, што Уладзімір Васільевіч працягнуў палявыя даследаванні і атрымаў шэраг вельмі каштоўных звестак аб нашчадках каланістаў-латышоў з Гомельшчыны [6]. У наступным ён паглыбіў распрацоўку тэмы, прысвяціў латышам Беларусі сваю доктарскую дысертацыю (2003) і 2 асобныя грунтоўныя манаграфіі [4; 7].

Ужо ў пачатку XXI ст. у Беларусі ўзрасла цікавасць да латышоў. Так, прыцягвае ўвагу праца 2008 г. пра малыя дыяспары Гомельшчыны, гомельскага ж даследчыка В. П. Пічукова. Гісторык, да прыкладу, прыводзіць звесткі пра латышоў з Нароўлі, Мазыра, Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета і с. Радзін Рэчыцкага павета [8]. Каштоўныя і артыкулы латышскага камуніста з Радзіна Плакшэ, што былі надрукаваны ў 1925 г. у мясцовых газетах [8, с. 21—24]. У 2012 г. з'явіліся калектыўнае выданне пра латышоў Віцебшчыны ў 1920—30-я гг. [2] і зборнік прац канферэнцыі, прысвечанай латышска-беларускім узаемаадносінам (пад рэд. М. Г. Каралёва) [9].

Нягледзячы на здабыткі папярэднікаў, спадзяёмся пашырыць звесткі пра «горватавых латышоў», якія — урыўкавыя і фрагментарныя — пакідаюць магчымасці для адрозных інтэрпрэтацый. Рэканструкцыя лёсу асобнай калоніі дазволіць паглыбіць веды пра сацыяльныя, эканамічныя і дэмаграфічныя працэсы ў Беларусі ў часы разбурэння «старога парадку», з улікам лакальнай спецыфікі, і пра тое, што паўплывала на скасаванне прыгону.

Горваты лічыліся выхадцамі з Харватыі. Першы вядомы прадстаўнік роду Іван Горват-Нікшыч быў у 1651 г. сотнікам у адным з палкоў дамовага войска Радзівілаў і асеў на Мазыршчыне [10, с. 217]. Вядомы таксама Ігнацы Горват, што быў у 1787 г. мазырскім гарадскім суддзёй. Яго сын Аляксандр у 1810-я гг. набыў маёнткі Барбараў і Белая Сарока [11, с. 51]. Нейкі ж Ігнацы Горват[1] у верасні 1816 г. набыў у фон Гольстаў маёнтак Нароўля з фальваркам Кажушкі і шэрагам вёсак. У 1825 г. маёнтак з вялікімі даўгамі ўспадкаваў Даніла Ігнатавіч Горват. Ён заклаў маёнтак у Пецярбургскай ашчаднай касе, узяў крэдыт і пабудаваў велічны палацавы комплекс у Нароўлі, але ў 1860-я гг. перадаў усё сыну Артуру [12]. Сам жа Даніла Горват выехаў у набыты ім у 1850 г. маёнтак Прыборск у Радамысельскім павеце (у Кіеўскай губерні, на мяжы з Мазырскім і Рэчыцкім паветамі) [13, с. 155]. Менавіта Артур Данілавіч Горват запрасіў каланістаў у свой маёнтак, сведчаннем чаго захаваўся імянны спіс латышоў ад 19 мая 1872 г. (гл. табліцу) [14, арк. 7—11].

Як вынікае з табліцы, у Нароўлю прыбылі 23 сям'і і 5 асобных халасцякоў (Карл Фрыц Данберг, Карл Разенфельд, нейкі Ульдар, Эрнст Осэ, Крыл Яннс Залайс). Паводле наменклатуры ў самой крыніцы справа ідзе пра 28 домагаспадарстваў. Атрымліваецца, што сем'і і халасцякі былі ўлічаны як асобныя гаспадаркі альбо як адказныя па дамове арандатары. Гэта дазваляе ўдакладніць звесткі У. В. Тугая, які адзначаў: у маі 1870 г. каля 40 латышскіх сем'яў прыбылі з Курляндыі ў маёнтак Нароўля і ўзялі ў арэнду зямлю ля фальварка Фізінкі і в. Галоўчыцы (2 сядзібы) [6, с. 33; 7, с. 67]. Адзначым, што В. П. Пічукоў таксама налічыў 28 сем'яў і адзіночак-латышоў з Курляндыі. Але ў яго адрозніваецца прачытанне часткі прозвішчаў каланістаў: «Да(о)ннберг» замест «Данберг», «Сипол» замест «Ситол» [8, с. 20]. Іншая справа, што крыніца датавана не 1870, а 1872 г. І з дакумента відаць, што размова ідзе пра сялян-каланістаў, якія прыбылі ў Нароўлю.

---

[1] Верагодна, згаданы Ігнацы Горват быў сынам Данілы Горвата і ўнукам Ігнацы Горвата, які быў мазырскім гарадскім суддзёй.

**Імянны спіс латышоў, што прыбылі ў Нароўлю ў 1872 г.**[2]

| № п/п | Імя. Імя па бацьку. Прозвішча | Узрост | Месца паходжання (мыза) | № п/п | Імя. Імя па бацьку. Прозвішча | Узрост | Месца паходжання (мыза) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | *Криш Каликст* | 47 | Стургоф | 36 | *Ингрид Ганс Розе* | 27 | Стургоф |
| 2 | его жена Лотта | ? | Стургоф | 37 | жена Анна | 30 | Стургоф |
| 3 | дочь Лотта | ? | Стургоф | 38 | сын Эрнейм | 6 | Стургоф |
| 4 | дочь Юля | ? | Стургоф | 39 | дочь Карелина | 5 | Стургоф |
| 5 | *Карл Эрнст Бригге* | ? | Стургоф | 40 | дочь Юля | 0,5 | Стургоф |
| 6 | жена Анелиза | 30 | Стургоф | 41 | (?) *Эрнст Осе* | 21 | Стургоф |
| 7 | дочь Либе | 10 | Стургоф | 42 | (?) *ст. Спектор* | 34 | Стургоф |
| 8 | дочь Фридрика | 6 | Стургоф | 43 | (жена?) Фредерика? | ? | Стургоф |
| 9 | дочь Корлина | 3 | Стургоф | 44 | дочь Лотта | 9,5 | Стургоф |
| 10 | *Ян Фриц Пине* | ? | Стургоф | 45 | дочь Кармина | 1,5 | Стургоф |
| 11 | жена Лотта | ? | Стургоф | 46 | *Фриц Анс Каптейн* | 37,5 | Стургоф |
| 12 | сын Карл | ? | Стургоф | 47 | жена Лотта | 34 | Стургоф |
| 13 | *Карл Лугге* | ? | Стургоф | 48 | сын Крисп | 13 | Стургоф |
| 14 | жена Лотта | ? | Стургоф | 49 | сын Индрик | 10 | Стургоф |
| 15 | сын Фриц | ? | Стургоф | 50 | сын Эрнест | 9 | Стургоф |
| 16 | сын Инге | ? | Стургоф | 51 | сын Карл | 0,5 | Стургоф |
| 17 | дочь Юлия | ? | Стургоф | 52 | дочь Маре | 18 | Стургоф |
| 18 | дочь Анна | ? | Стургоф | 53 | *Карл Фриц Данберг* | 18 | Стургоф |
| 19 | дочь К(?) | ? | Стургоф | 54 | *Фриц Крисп Ян Данберг* | 45 | Стургоф |
| 20 | дочь Д(?) | ? | Стургоф | 55 | жена Юле | 38 | Стургоф |
| 21 | *Эрнст Ян Боуманн* | 44 | Стургоф | 56 | сын Аннс | 1 | Стургоф |
| 22 | жена Грета | 39 | Стургоф | 57 | *Карл Крисп Ян Данберг* | 43 | Стургоф |
| 23 | сын Крит | 15 | Стургоф | 58 | жена Юле | 26 | Стургоф |
| 24 | сын Янн | 2 | Стургоф | 59 | сын Крисп | 7 | Стургоф |
| 25 | дочь Лотта | 19 | Стургоф | 60 | сын Индрик | 3 | Стургоф |
| 26 | дочь Анлиза | 12 | Стургоф | 61 | дочь Лотта | 9 | Стургоф |
| 27 | дочь Либе | 6 | Стургоф | 62 | (?)*Ульдер* | 20 | Стургоф |
| 28 | *Фриц Спалле* | 22 | Стургоф | 63 | *Карл Спектор* | 40 | Стургоф |
| 29 | мать его Либе | 50 | Стургоф | 64 | жена Анна | 30 | Стургоф |
| 30 | дочь ее Анна | 22 | Стургоф | 65 | сын Крисп Ян | 13 | Стургоф |
| 31 | *Андрей Данберг* | 54 | Стургоф | 66 | *Яннс Лаубанас* | 47 | Кевельн |
| 32 | жена Либе | 50 | Стургоф | 67 | жена Лотта | 30 | Кевельн |
| 33 | сын Карл | 22 | Стургоф | 68 | сын Яннс | 11 | Кевельн |
| 34 | сын Крил | 13 | Стургоф | 69 | *Фриц Лугге* | 48 | Кевельн |
| 35 | дочь Лизе | 16 | Стургоф | 70 | жена Лотта | 30 | Кевельн |

[2] Даныя спіса пададзены паводле архіўнага дакумента на мове арыгінала.

*Заканчэнне табліцы*

| № п/п | Імя. Імя па бацьку. Прозвішча | Узрост | Месца паходжання (мыза) | № п/п | Імя. Імя па бацьку. Прозвішча | Узрост | Месца паходжання (мыза) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 71 | сын Яннс | 18 | Кевельн | 91 | жена Лизе | 40 | Альт Ацц |
| 72 | сын Карл | 16 | Кевельн | 92 | сын Вилле | 2,5 | Альт Ацц |
| 73 | сын Яне | 12 | Кевельн | 93 | *Крил Яннс Залайс* | 19 | Блиден |
| 74 | сын Вилле | 6 | Кевельн | 94 | *Эрнст Кипльст* | 35 | Блиден |
| 75 | дочь Анмиз | 8 | Кевельн | 95 | жена Юлия | 40 | Блиден |
| 76 | *Янс Гринфельд* | 54 | Кевельн | 96 | сын Яннс | 12 | Блиден |
| 77 | жена Катерина | 50 | Кевельн | 97 | дочь Ловиза | 14 | Блиден |
| 78 | сын Фриц | 14 | Кевельн | 98 | *Карл Розенфельд* | 28 | Блиден |
| 79 | сын Яннс | 11 | Кевельн | 99 | *Фердинант Кровц* | 26 | Грис |
| 80 | дочь Лотта | 3 | Кевельн | 100 | жена Карина | 25 | Грис |
| 81 | (?) *Грасман* | 35 | Кевельн | 101 | дочь Анна | 3 | Грис |
| 82 | жена Лавиза | 33 | Кевельн | 102 | *Карл Кристоф Рейс* | 26 | Стургов |
| 83 | сын Карл | 10 | Кевельн | 103 | жена Анна | 24 | Стургов |
| 84 | дочь Либе | 1,5 | Кевельн | 104 | дочь Карлинс | 1 | Стургов |
| 85 | *Фриц Страздинс* | 39 | Альт Ацц | 105 | сестра жены Карлинс Лерр | 18 | Стургов |
| 86 | жена Карлина | 34 | Альт Ацц | 106 | мать жены Анна Лига | 60 | Стургов |
| 87 | сын Карл | 17 | Альт Ацц | 107 | *Юрре Ситол* | 25 | Сессилеп |
| 88 | сын Вильс | 15 | Альт Ацц | 108 | жена Либе | 21 | Сессилеп |
| 89 | сын Яннс | 9 | Альт Ацц | 109 | отец жены Яннс Лерр | 60 | Сессилеп |
| 90 | *Яннс Анс Ядковский* | 30 | Альт Ацц | Усяго: 109 чалавек, 28 гаспадарак, 23 сям'і, асобна пададзены таксама яшчэ 5 бабылёў. | | | |

Звернемся больш шчыльна да разгляду каланістаў. Так, паводле крыніцы пашпарты былі толькі ў 9 са 109 чал. (8,3 %), ці ў 2 сем'яў: Эрнста Кіпльста з мызы Блідэн і Андрэя Данберга з мызы Стургоф. З гэтага вынікае, што 100 чал. дабіраліся ў Нароўлю нелегальна. Падобна да таго, як з'явіліся першыя латышы-каланісты ў маёнтках памешчыка К. Каміёнка Галічы (Клімавіцкі павет) у 1866 г.: памешчык сам ездзіў і агітаваў перасяліцца да яго, дамаўляўся з сялянамі і праз тое меў пагрозы ад мясцовых курляндскіх землеўласнікаў расправіцца з ім, бо справа ішла менавіта пра ўцёкі сялян [6, с. 31]. Прычынай таму было залежнае становішча сялян: памешчыкі ў Латвіі і Эстоніі захоўвалі правы вотчыннай паліцыі і шырока карысталіся беззямеллем сваіх сялян для выгоднага найму іх на працы. У сваю чаргу памешчыкі ў Беларусі (той жа Канстанцін Каміёнак) пабачылі працавітасць латышоў і цанілі яе.

Пра залежнае становішча латышоў гаворыць тое, што крыніца месцам паходжання для ўсіх іх называе тыя ці іншыя мызы ў Курляндыі. Так, з мызы Стургоф прыбылі 65 чал. (59,6 %), Кевельн — 19 (17,4 %), Альт Ацц — 8 (7,3 %), Блідэн — 6 (5,5 %), Стургаў — 5 (4,6 %), Грыс — 3 (2,8 %) і Сесілеп — 3 чал. (2,8 %)[3] (гл. табліцу). Між тым мыза Блідэн належала баронам фон Лівенам, што мелі моцныя сувязі пры расійскім імператарскім двары. Гэта дазваляе ацаніць

[3] Мяркуем, што гэтыя мызы (маёнткі, сядзібы) знаходзіліся на паўднёвым захадзе Курляндыі, на тэрыторыі Салдускага раёна Латвіі, у раёне возера Цыецэрэс.

ступень рызыкі, на якую ішлі беларускія памешчыкі кшталту Каміёнка. Цікава, што сярод перасяленцаў дамінавалі мужчыны: 59 чал., ці 54 % (1,2 : 1). У асобных групах гэта дыспрапорцыя была большая: з мызы Кевельн — 12 мужчын (63 %) з 19 чал., з мысы Альт Аўц — 6 мужчын з 8 чал. (75 %). Сярэдні ўзрост каланістаў складаў 22,5 гадоў, у мужчын — 22,7 гадоў, у жанчын — 22 гады. Такім чынам, сярод каланістаў пераважалі людзі сталага працаздольнага ўзросту. Асобы да 16 год складалі 35 % (38 чал.), асобы працаздольнага па мерках тых часоў узросту ад 16 да 50 гадоў — 61,5 % (67 чал.) (у тым ліку 3 асобы 50-гадовага ўзросту), асобы 18—35 гадоў — 29,4 % (32 чал.). Людзей сталага ўзросту было няшмат: усяго старэйшых за 50 гадоў — 4 чал. (3,7 %) (у тым ліку Ганна Ліге і Янс Лер 60 гадоў і Янс Грынфельд і Андрэй Данберг 54 гадоў). Пры гэтым дзяцей (56 чал.) на 1 сям'ю прыходзілася для тых часоў няшмат — 2,4. Сярэдні ўзрост іх складаў 9,5 гадоў. Калі супаставіць гэта з сярэднім узростам супругаў (38,8 і 33,9 гадоў), то можам пабачыць праяву позняга заключэння шлюбаў у курляндскіх латышоў. Патлумачыць гэту з'яву можна перадусім матэрыяльнымі ўмовамі. Найбольш красамоўна паказвае тэндэнцыю, да прыкладу, сям'я Андрэя Данберга і яго жонкі Лібе (адпаведна 54 і 50 гадоў), што мелі траіх дзяцей — 22, 16 і 13-гадовага ўзросту. У той жа час сярэдні ўзрост 5 латышоў-халасцякоў складаў 21,2 гадоў. На жаль, дакумент мае пашкоджанні (дзіры на лістах), праз што не чытаюцца асобныя імёны (сям'я Карла Луге) і невядомы ўзрост для 16 асоб, ці амаль 15 % імёнаў у спісе.

З наступных па часе звестак аб каланістах у маёнтку вядома толькі пра тое, што ў фальварку Каралін была латышская калонія. Яна разам з участкамі ў мястэчку Нароўля, вінакурняй і цагельным заводам, а таксама сенакосамі і ворыўнымі ўгоддзямі фальварка Нароўля адышла ў арэнду да Кеневіча [15, арк. 18]. Гаворыцца пра няўдачу ў гаспадаранні Кеневіча і калоніі, што можна звязаць, як тое бачна з апісання ўгоддзяў, з балоцістай мясцовасцю ваколіцы (не вялася бульба, не было пашы) [15, арк. 17, 18—18 адв.]. Цікава, што канфлікт паміж пасэсарам (дваранінам з Пінскага павета Францам Юльянавічам Кеневічам) і ўласнікам Нароўлі Артурам Горватам выбухнуў неўзабаве пасля заключэння кантракта на 12 гадоў (10 жніўня 1876 г.). Прычым пасэсар Кеневіч абвінавачваўся ў нявыплаце 1750—1850 руб. арэнды і парушэнні ўмоў дамовы: а менавіта ў тым, што не адрамантаваў і не застрахаваў пабудовы. У той жа час уласнік атрымаў сустрэчную прэтэнзію на 4060 руб., бо не даставіў пасэсару неабходнага лесу, хаця і мусіў зрабіць гэта паводле дамовы. Прычым Горват вельмі баяўся, што Кеневіч распрадасць маёмасць фальварка і ён не зможа атрымаць грошы за арэнду [15, арк. 1—9; 16, арк. 1—10]. З гэтага можна зразумець, што абурэнне пасэсара было чымсьці падмацаванае, а зусім непрацяглы час гаспадарання Кеневіча гаворыць аб сапраўдных праблемах у гаспадарцы і фальварка, і арандатараў-латышоў. Мы ўпэўнены, што справа тут ва ўмовах мясцовасці.

Так, паводле вымярэнняў зямлі ў маёнтку Нароўля (недзе на пачатку 1870-х гг.) ва ўласнасці А. Д. Горвата было 44496,5 дзес., з якіх 26444,75 дзес. (59 %) упершыню было апісана землямерам і толькі 11 401,14 дзес. (26 %) — раней (у 1811 і 1829 гг.) [17, арк. 9 адв.]. З гэтай зямлі пры «фальварку» Нароўля было 3567,7 дзес., з якіх за «былой слабадой Каралін» лічылася 94,56 дзес., а за «былой слабадой Фізінкі» — 248,16 дзес. [17, арк. 6]. Такім чынам, сярэдні памер надзелу арандатара-латыша ў Караліне мог складаць 3,4 дзес. (з улікам Фізінкі — 12,2 дзес.). Насцярожвае тая акалічнасць, што абедзве слабады ў крыніцы названы былымі, а значыць — пакінутымі з-за неўрадлівай глебы. У доказ таго маем апісанне валодання Нароўля[4] падчас перагляду кантрыбуцыйнага збору з памешчыкаў польскага паходжання ўвосень 1874 г.: усе гаспадарчыя ўгоддзі (ралля, сенакос, агарод — 1230 дзес.) аднесены да 3-й (горшай) катэгорыі, а даход ад гэтых угоддзяў ацэнены ў 196,8 р. [18, арк. 53 адв.]. У той жа час, напрыклад, Кеневіч па дамове 1876 г. быў вінаваты ўласніку 3000 р. арэнднай платы ў год.

[4] Уласнікам зямлі ў крыніцы названы памешчык Даніла Горват.

Інвентар ад 1 жніўня 1877 г., што дадаваўся да арэнднай дамовы Кеневіча і Горвата, налічвае пры фальварку толькі адзін жылы дом, а таксама 12 хлявоў для авечак (памерамі 14,5/12,5/4 аршыны), з якіх толькі адзін новы, а таксама адзін хлебны свіран і малацільную машыну [19, арк. 38—40 адв.]. З іншага сведчання можна пэўна даведацца, што гэтыя і іншыя пабудовы пры фальварку тэрмінова патрабавалі рамонту, і праз тое Кеневіч нават адмовіўся ўключыць у арэнду ветраны млын, а таксама тое, што ўсяго было 58 двайных моргаў пасеваў (56,6 дзес.) [19, арк. 38—40 адв.]. Мяркуем, што латышам давялося пасяліцца ў старых аўчарнях Горвата і распрацоўваць мясцовы балоцісты лес («палессе») пад раллю і сенакосы, якіх было мала ў маёнтку і стала яшчэ меней пасля рэформы 1861 г.

На жаль, не знойдзены і, пэўна, не захаваліся арэндныя дамовы. Можна правесці паралелі. Устаноўлена, што ў той жа час у Клецкай ардынацыі Радзівілаў, Гомельскай вотчыне Ф. І. Паскевіча, у маёнтках на Валыні былі распаўсюджаны арэндныя дамовы на 10—12 гадоў[5]. К. Шкільтэр і У. В. Тугай прыводзяць як звычайныя для другой паловы XIX ст. дамовы на 12 гадоў. Вядомая, напрыклад, дамова з маёнтка Рудабелка 1897 г.: першыя 5 гадоў каланіст нічога не плаціць і распрацоўвае дзялянку, затым штогод сплачвае па 3 р. з 1 дзес. ворыва. Ён абавязваўся таксама ўгнойваць зямлю і не мог прадаваць бульбу ў іншыя эканоміі [5, с. 60]. У пэўным сэнсе гэта тыповая дамова для свайго часу. Нюанс жа з бульбай — неабходная ўмова для забеспячэння бровара сыравінай. Вядома, што ў тым жа 1874 г. па Нароўлі Горват атрымліваў даходу ад вінакурэння ў 2 разы болей, чым ад лесу ці фальваркавай гаспадаркі [18, арк. 53 адв. — 54]. Як відаць з апісання рабочага інвентару і пасеваў у 1877 г., менавіта вырошчванне бульбы было галоўнай мэтай перадачы фальварка ў арэнду Кеневічу [19, арк. 37 адв.].

Тыповай была сітуацыя, калі з часам уласнік падымаў арэндную плату. Напрыклад, з 2 да 5 р. за 1 дзес. Паводле вусных сведчанняў апытаных У. В. Тугаем нашчадкаў каланістаў (Ганна Карлаўна Брыга) менавіта Артур Горват з дапамогай арміі выселіў арандатараў з маёнтка па сканчэнні дамовы і заняў распрацаваныя тымі ўгоддзі ці пад пашы, ці пад яблыневы сад (для кандытарскай фабрыкі). З нараўлянскіх латышоў болей паловы пасяліліся ў с. Радзін (зараз у Хойніцкім раёне) [6, с. 34—35; 7, с. 68—69]. В. П. Пічукоў удакладняе, што 50 двароў латышоў перасялілася ў с. Радзін з Нароўлі менавіта ў 1907 г.[6] [8, с. 21]. Вынікае, што пасля 35 гадоў асталявання каланістаў і дзесьці па сканчэнні 3 тэрміну дамовы з латышамі яна была перарвана. Прычыну бачым перадусім у патрэбе займець добрыя сенакосы, бо недзе ў гэты час Артур Горват з сынам Эдвардам заснавалі сенапрэсавальны завод і наладзілі буйныя пастаўкі сена ў войска [19, арк. 1—12, 25—28 адв.].

Спрэчная інфармацыя пра гаспадарку радзінскіх (нараўлянскіх) латышоў на 1920-я гг. Так, з аднаго боку, Плакшэ пісаў, што мясцовыя латышы (200 чал.) на сваіх 4 дзес. вядуць руплівую гаспадарку з 4—6-польным севазваротам, трымаюць па 7 галоў жывёлы на гаспадарку ў сярэднім, адукаваныя [8, с. 23—24]. З другога — піша пра дрэнную пясчаную ды балоцістую глебу, гібель жывёлы і ацэньвае гаспадарча-культурны ўзровень каланістаў як «няшмат вышэйшы» за мясцовых сялян [8, с. 21—23]. Падобную супярэчлівасць, нягледзячы на агульную ацэнку гаспадаркі латышскіх каланістаў як «адсталай», знаходзім і ў К. Шкільтэра: яны ўводзілі травасеянне і шматполле, ткалі добрае хатняе сукно і рабілі добрыя вазы, становяча ўплывалі на побыт суседніх беларускіх сялян [5, с. 112—117]. У. В. Тугай пісаў пра латышскіх хутаран як капіталістычных фермераў і поспехі іх кааператываў [6, с. 55—57; 7, с. 72—80; 4, с. 105]. Гэтыя прыклады, аднак, браліся сярод латышскіх хутаран на Віцебшчыне, а таксама на Клімавіччыне (фермеры А. І. Антусевіч, І. Ф. Білдэр, К. Розенштэйн). Так, дбайнасць, працавітасць, большая культурнасць латышоў прызнаваліся як сучаснікамі (памешчыкамі, беларускімі сялянамі,

[5] Аўтар адсылае тут да сваіх ранейшых прац, асабліва кандыдацкай дысертацыі 2010 г.

[6] Гл. выданне «Гарады і вёскі Беларусі» (Т. 2, кн. 2 па Гомельскай вобласці. Мінск, 2005), што называе лічбу ў 15 двароў перасяленцаў-латышоў з Фізінак.

аўтарамі навуковых і публіцыстычных твораў эпохі), так і даследчыкамі праблемы ў наступным [2, с. 36; 5, с. 117; 6, с. 37, 57; 7, с. 70, 72, 76]. Між тым мы ўпэўнены, што ўплыў прыродных фактараў (на Палессі), да якіх адсылае Плакшэ, сапраўды меў месца. Выпадак з канфліктам Кеневіча і Горвата 1877 г. тое толькі пацвярджае. На карысць абмежаванаму поспеху гаспадаркі ў падобных умовах нават у руплівых латышоў сведчыць і той факт, што спатрэбілася больш за 30 гадоў, каб распрацаваць угоддзі пад Горватавы сенакосы. Пэўна, прадпрымальны, але праз гэта засяроджаны на асабістай выгодзе Артур Горват выгнаў бы латышоў-арандатараў і раней, калі б абставіны таму спрыялі.

Мяркуем, што галоўнай мэтай Артура Данілавіча Горвата пры заснаванні калоніі было забеспячэнне сыравінай вінакурань [11, с. 52], якія былі для яго галоўнай крыніцай атрымання даходаў. Каланісты Горвату спатрэбіліся з-за недахопу працоўных рук і неспрыяльных палескіх умоў гаспадарання, што вымагалі дадатковых высілкаў і сродкаў. Так, нават у прыгонныя часы, у 1861 г., уласнік маёнтка Нароўля затраціў 72,18 р. на найм работнікаў для прац у фальварку [17, арк. 4 адв.]. Пасля скасавання прыгоннага права і адасаблення з 1863 г. сялян з надзеламі зямлі ад памешчыка абцяжараны кантрыбуцыйным зборам у 14 % даходу [18, арк. 54] Горват быў вымушаны знайсці нейкае выйсце. Ён, як і іншыя прадпрымальныя землеўласнікі краю, заахвоціў да перасялення латышоў, што жылі ў значна больш цяжкіх за мясцовых сялян умовах. Як паказвае аналіз крыніц, сярод латышскіх перасяленцаў дамінавалі сталыя працаздольныя мужчыны, а дзяцей было меней (1/3, а не 1/2 ад членаў домагаспадарства), што было характэрна для сялянскіх сем'яў у тыя часы. Даказана, што ўмовы пражывання ад самага пачатку былі ў каланістаў вельмі цяжкімі на Палессі: ворыва было мала, а мясцовасць і глеба — неўрадлівыя. Звяртае ўвагу і тая акалічнасць, што за 35 гадоў каланісты ў Горвата так і не разжыліся зямлёй ва ўласнасць.

Аднак дастаткова доказных сведчанняў, каб назваць латышскіх каланістаў больш гаспадарлівымі, працавітымі і культурнымі, чым мясцовыя сяляне. Мяркуем, што прычыны з'явы варта пабачыць у пратэстанцкай рэлігійнасці латышскіх сялян. Да падобных высноў, дарэчы, прыходзіць В. П. Пічукоў пры вывучэнні нямецкіх каланістаў на Гомельшчыне ў той жа час і пазней — у 1920—30-я гг. [8, с. 68]. Так, даследчыкамі было заўважана, што веравызнанне закладвала асаблівы этас і спосаб жыцця: пратэстанцкая рэлігійнасць заклікала праз культ Пісання да адукаванасці, да адказнасці, самапавагі і павагі да сваёй і чужой уласнасці. Праз гэта, відаць, многім мясцовым латышам давялося ў 1920—30-я гг. выехаць у Латвію альбо быць рэпрэсіраванымі [4, с. 107—114, 235]. Прычынай таму было тое, што індывідуалізм, самадастатковасць і самастойнае гаспадаранне не было патрэбным у абставінах калектывізацыі і насаджэння фармальнага карпаратывізму савецкага грамадства.

Падсумоўваючы, адзначым, што латышскія каланісты пры іх прыездзе на Палессе знаходзіліся ў выключна цяжкім эканамічным становішчы. Фактычна, яны не мелі ніякага дабра, а таксама вопыту гаспадарання ў спецыфічных палескіх умовах. У гэтым плане адносна мясцовых сялян-старажылаў у іх былі значна меншыя магчымасці. Латышы мусілі прымаць незайздросныя ўмовы запрашэння палескага памешчыка Горвата, пазбаўленага рабочых рук па скасаванні прыгоннага права. Заўважым і тое, што апошні прымаў каланістаў на руіны сваёй авечкагадоўчай гаспадаркі і таксама не мог прапанаваць прыбыльцам нічога лепшага. Гэта быў зваротны бок палітыкі эканамічнага, юрыдычнага і палітычнага нераўнапраўя, што насаджаў у Заходнім краі Расійскай імперыі бюракратычна-ваенны рэжым самадзяржаўя [20, с. 173]. Бачым, як архаічны механізм імперыі адкрыта застасоўваў архаічныя ж і грубыя меры ўніфікацыі. Па-свойму вопыт латышскай калоніі ў маёнтку Горвата быў яркім лакальным адбіткам больш шырокай сацыяльнай сістэмы, што атачала маёнтак. Відаць, што прапанаваныя латышскім каланістам умовы кантракта мала садзейнічалі іх гаспадарчаму поспеху: больш за 30 гадоў яны не дасягнулі таго ўзроўню гаспадарак, што дазволіў бы ім выкупіць апрацаваную зямлю ў Горвата. Аднак зразумела і тое, што прадуктыўнасць і аддача ад зямлі ў латышскіх

каланістаў павінна была быць большай, чым у мясцовых суседніх сялянскіх гаспадарках. Прама ўказвае на тое сведчанне Плакшэ 1920-х гг. Менавіта інтэнсіўныя дробныя гаспадаркі каланістаў, а не больш экстэнсіўныя мясцовых сялян маглі стварыць і стварылі прыдатныя палеткі для добрых мурожных сенакосаў і, можа, для саду на частцы гэтых зямель.

Высветлена, што ў 1907 г. унук Данілы Горвата Эдвард не працягнуў дамовы на арэнду зямлі і з дапамогай ваеннага аддзела выгнаў з Фізінак і Караліна (часткі маёнтка Нароўля) латышскіх каланістаў. Затым у 1910 г. ён заснаваў Міхнаўскі сенапрэсавальны завод, які хаця і называецца ў крыніцах «невялікім», але, да прыкладу, увосень таго ж 1910 г. ажыццяўляў пастаўку 50 тыс. пудоў прэсаванага сена на 17 тыс. р. для Кіеўскай ваеннай акругі. Яшчэ адным прамысловым праектам Эдварда Артуравіча Горвата стала кандытарская фабрыка ў Нароўлі: з архіўных крыніц вядома, што ў жніўні 1913 г. фабрыка дала першую прадукцыю (цукеркі і мармелад), аднак ужо ў 1914 г. яна не працавала [20, с. 173, 175]. Э. А. Горват з 1905 г. не мог, падобна да бацькі Артура Горвата, атрымліваць вялікія даходы ад продажу лесу з маёнтка Нароўля (5 лясных дачаў з 6,5 тыс. дзес. у пачатку XX ст.), бо неабмежаваная высечка дрэва памешчыкам і драпежны выпас жывёлы сялянамі паводле сервітутнага карыстання — усё гэта спустошыла лясы [20, с. 174—175]. Відаць, што і вінакурэнне губляла сваё ранейшае значэнне для памешчыкаў. Калі Даніла Горват дзякуючы латышскім каланістам толькі і змог наладзіць пастаўкі бульбы для Нараўлянскай вінакурні, то яго ўнук Эдвард бачыў на той час маштабны выкуп казной права прапінацыі ў памешчыкаў, а таксама хуткі крызіс вінакурэння. Сапраўды, вядома, напрыклад, што даход ад вінакурэння ў Радзівілаў скараціўся ў 1912—1914 гг. у 5 разоў (з 90,5 да 12,9 тыс. р.) як вынік пераходу краіны да норм «сухога закону», абвастрэння канкурэнцыі і агульнай стагнацыі галіны [20, с. 122].

Тлумачэнне ж той сітуацыі, што гаспадаркі латышскіх каланістаў, нягледзячы на параўнаўча больш нізкія стартавыя магчымасці, аказаліся адносна больш эфектыўнымі, бачым (услед за некаторымі даследчыкамі) у немалой меры ў канфесійным фактары. Так, евангелічнае вызнанне латышоў стымулявала іх да авалодання пісьмом, да новых ведаў, а праз тое і да прымянення новых ведаў і тэхналогій у гаспадарцы. Уплывала тое і на ўзроўні паўсядзённай патрабавальнасці і самааддачы гэтых людзей, агульна стымулявала да маральнага развіцця і кааперацыі на аснове хрысціянскай абшчыны. Мяркуем, што ва ўмовах сучаснага ўсё больш мультыкультурнага свету гэты досвед можа быць цікавым і павінен вывучацца для распрацоўкі рэкамендацый і стратэгій устойлівага развіцця еўрапейскіх краін і народаў. Так, нягледзячы на адрозненні ў мове, побыце і веравызнанні ад мясцовых беларускіх сялян, латышы ў Нароўлі не зазнавалі супярэчак з мясцовымі сялянамі. Тое ж да 1907 г. не вынікала ў іх канфлікту і з землеўласнікамі — памешчыкамі Горватамі. Наадварот, мела месца эфектыўнае ўзаемадзеянне, бо складаныя прыродныя ўмовы Палесся і сацыяльныя палітычнага рэжыму самадзяржаўя былі той перашкодай да гаспадарчага поспеху, якую даводзілася адольваць сумесна. Па-свойму гэта быў правобраз той мадэлі ўзаемадзеянняў, якую, да прыкладу, прапаноўвае Пасланне X Гнезненскага з’езда (сакавік 2016 г.) аб Еўропе новых пачаткаў [21].

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Эгле Валдис*. Селы [Электронный ресурс] // Этноэнциклопедия. URL: http://www.etnosy.ru/ node/ 317 (дата обращения: 02.05.2013).

2. «Белорусские» латыши на приграничье (в межвоенный период) / М. Г. Королёв [и др.]. Минск : РИВШ, 2012. 84 с.

3. *Шахотько Л. П.*, *Куделка Д. Н.* Этноязыковый состав населения Белоруссии // Вопр. статистики. 2002. № 11. С. 30—37.

4. *Тугай У. В.* Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі. Мінск : БДПУ, 2003. 2-е выд., стэрэат. 305 с.

5. *Шкільтэр К.* Латыскія калёніі на Беларусі: Гістарычнае развіцьцё латыскіх сялянскіх гаспадарак. Менск : Друкарня Беларус. акад. навук, 1931. 271, [3] с.

6. *Тугай У. В., Галавач А. В.* Дзе песні з Даўгавы гучалі. Мінск : Полымя, 1992. 87 с.

7. *Тугай У. В.* Латышы на Беларусі. Мінск : Выд. У. М. Скакун, 1999. 136 с.

8. Малые диаспоры Гомельщины в 20—30-е гг. XX века : аналитические материалы и документы Государственного архива Гомельской области / под ред. В. П. Пичукова. Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2008. 250 с.

9. Латыши и белорусы: вместе сквозь века : сб. науч. ст. / под общ. ред. М. Г. Королёва. Минск : РИВШ, 2012. 89 с.

10. Энциклопедический словарь издателей Ф. А. Брокгауза и И. А. Ефрона : в 82 т. СПб. : Тип. И. А. Ефрона, 1893. Т. 9. 447 с.

11. Памяць : Гісторыка-дакументальная хроніка Нараўлянскага раёна / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. : П. П. Рабянок, К. Ф. Ярмоленка. Мінск : БЕЛТА, 1998. 448 с.

12. *Адамович С.* Дворец в Наровле: история и реалии // Архитектура и строительство. 2010. № 2. С. 58—61.

13. Сказания о населенных местностях Киевской губернии / собрал Л. Пожилевич. Киев : Тип. Киево-Печерской Лавры, 1864. 763 с.

14. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). Ф. 986. Оп. 1. Д. 20 — Именной список крестьян имения Наровля. 1872 г.

15. НИАБ. Ф. 986. Оп. 1. Д. 44 — Дело о невыполнении Ф. Ю. Кеневичем контракта на аренду фольв. Наровля Речицкого у. 1877—1878 гг.

16. НИАБ. Ф. 986. Оп. 1. Д. 45 — Прошения А. Д. Горвата, Ф. Ю. Кеневича в Минскую окладную палату уголовного и гражданского суда по делу об аренде Кеневичем ф[ольварка] Наровля. 27.IX.1877 г.

17. НИАБ. Ф. 986. Оп. 1. Д. 24 — Ведомости учета земельных владений имения Наровля. 1860 г.

18. НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 2503 — Дело о разрешении % сбора с лиц польского происхожд. на 1875—1877 гг. по Речицкому у. 1874 г.

19. НИАБ. Ф. 986. Оп. 1. Д. 43 — Инвентарь строений фольв. Наровля Речицкого у., статистические сведения, таксационное описание и план Наровлянского лесничества и др. 1877—1911 гг.

20. *Кохнович В.* Хозяйство в имениях на Полесье в 1861—1914 гг. Saarbrűcken: LAP, LAMBERT Academic Publishing, 2015. 356 с.

21. Przesłanie X Zjazdu Gnieźnieńskiego. «Nowy człowiek w każdym z nas» [Электронны рэсурс] / X Zjazd Gnieźnieński z tematem «Europa nowych początków. Wyzwalająca moc chrześcijaństwa»; Gnezno (Polska), 11—13 marca 2016 г. 2016. URL: http://www.polskieradio.pl/5/3/ Artykul/1594234,Przeslanie-X-Zjazdu-Gnieznienskiego-Nowy-czlowiek-w-kazdym-z-nas (дата звароту: 15.03.2016).

Статья поступила в редакцию 8 октября 2015 г.